*ДУА "Сярэдняя школа №1 г.Сянно імя З.І.Азгура"*

# Памяткі па беларускай літаратуры

*У дапамогу вучням*



## Схема вывучэння жыцця і творчасці пісьменніка.

1. Агульная характарыстыка гістарычнага перыяду, у які працаваў ці працуе пісьменнік.
2. Асноўныя асаблівасці літаратурнага працэсу.
3. Кароткія звесткі з біяграфіі пісьменніка.

Характарыстыка творчасці пісьменніка:
а)пачатак літаратурнай дзейнасці;
б)этапы ці перыяды дзейнасці.
Можна выкарыстоўваць сінхранічныя табліцы. Напрыклад, па біяграфіі Максіма Танка:
)агульная характарыстыка тэматыкі, праблематыкі і мастацкіх

| Даты (перыяд) | Адметнасць часу | Жыццё пісьменніка | Творы |
|---|---|---|---|
| 1921-1939 (заходнебеларускі перыяд) | Заходняя і Усходняя Беларусь | Вучоба ў Віленскай, Радашковіцкай і Віленкай гімназіях, удзел у вызваленчым руху, зняволенне ў турме “Лукішкі”, праца ў легальным і падпольным друку | Зборнік “На этапах” |

асаблівасцей зборнікаў і найбольш значных твораў.
5.Пісьменнік і грамадства:
а)сацыяльная пазіцыя мастака, яго ўдзел у грамадскім жыцці;
б)уплывы грамадска-палітычных абставін на творцасць пісьменніка;
в)ацэнкі твораў або новае прачытанне ў сувязі са зменамі грамадска-палітычных абставін.
6.Значэнне дзейнасці пісьменніка і яго суаднесенасць з сусветным літаратурным працэсам.

## Алгарытм аналізу верша.

Тэма. Галоўная думка.
Якім настроем прасякнуты верш?
Якія пачуцці ён выклікае?
Уявіце створаныя паэтам вобразы і карціны, апішыце іх.
Пры дапамозе якіх слоў аўтар стварае пейзажныя малюнкі. Назавіце вобразныя сродкі.
Ці спадабаўся вам верш (гарманічнасць формы, рытм, мелодыя, эмацыянальнасць).



## Памятка. Шматаспектны аналіз мастацкага твора. Вершы.

1. Выразнае чытанне твора
2. Акрэсліць тэму і ідэю
Аб чым расказваецца, да якога вываду падвёў аўтар.
3. Праблематыка
Якія праблемы ўзнімаюцца: часу, эпохі, жыцця чалавека, свае асабістыя.
4. Аўтар і лірычны герой
Хто ён, які ён
5. Аўтабіяграфізм твора
Калі ведаем: дзяцінства, юнацтва, успаміны, перажытае, прырода, мова – што склала жыццёвы набытак аўтара і надае твору пераканаўчасць і верагоднасць
6. Манера апавядання
Перадаў захапленне, проста паведаміў, расказаў пра нейкую падзею, нешта абагуліў, зрабіў вывад, апісаў прыгыжосць нечага, перадаў напружанасць дзеяння, падкрэсліў трагізм моманту, абурэнне, радасць, асалоду, трывогу, гнеў, горыч, журасць.
7. Манера выказвання
Стрыманая, строгая ці экспрэсіўна-эмацыянальная.
8. Які ён перад намі
Сціплы, сарамлівы, даверлівы і эмацыянальны, няўрымслівы, цярплівы, стрыманы, пазбаўлены самалюбавання.
9. Сюжэт (калі ёсць)
10. Кампазіцыя (калі ёсць)
11. Жанр твора
Аповесць, верш-заклік, успаміны, адозва, роздумы, споведзь, эсэ, балада, эпітафія і г.д.
12. Тэматычная разнавіднасць
Грамадзянская, філасофская, інтымная, пейзажная
13. Лексічны аналіз
Асаблівасці словаўтварэння, шматзначнасць, аўтарская лексіка, дыялектызмы, перыфразы, аўтарскія неалагізмы
14. Фанетычныя асаблівасці
Алітэрацыя – паўтарэнне зычных, асананс – паўтарэнне аднолькавых або падобных галосных гукаў, гукаперайманне ( Л – мілагучнасць, мяккасць; С – свіст ветру, шум лесу; Ж – журчанне)
15. Паэтычны сінтаксіс
Парадак слоў (прамы і адваротны), рытарычныя звароты, клічнікі, паўторы, шматкроп’і, працяжнікі, анафара, эпіфара, рэфрэн, паралелізм, антытэза (супрацьпастаўленне), якія часціны мовы часцей паўтараюцца і для чаго, тыпы сказаў
16. Мастацкія тропы
Эпітэты, метафары, іронія, гумар і г.д.
17. Інтанацыя выказвання ў вершы
18. Вершаваныя памеры
Рыфма, рытміка ці верлібр(белы верш)

## Літаратуразнаўчы аналіз мастацкага твора

1. Агульная характарыстыка гістарычных абставін, у якіх быў напісаны твор.
2. Якое месца займае твор у сістэме літаратурнай дзейнасці пісьменніка?
1. Да якога перыяду ён адносіцца?
2. Ці працаваў аўтар у час напісання гэтага твора над іншымі?
3. ***Звесткі аб:***
1. Даце першай публікацыі.
2. Уплыве твора на свядомасць чытачоў, фарміраванне грамадскай думкі.
3. Ацэнка твора, яго ідэйнай накіраванасці ў сувязі з гістарычна-палітычнымі зменамі ў грамадстве.
4. Характарыстыка ідэйнага зместу твора.
5. Вашы асабістыя адносіны да мастацкага твора.
6. Месца твора ў гісторыі культуры.
7. Характарыстыка:
1. Часу, падзеі, якія апісваюцца у творы.
2. Персанажаў.
3. Асабістасці сюжэта, кампазіцыі, стылю твора.
4. Праблематыкі, канфлікту.

## Схема кароткай літаратуразнаучай характарыстыкі жыцця і творчасці пісьменніка

1. Агульная характарыстыка гістарычнага перыяду, у які працавау (працуе) пісьменнік.
2. Кароткія звесткі біяграфічнага характару аб аутары.
3. Характарыстыка творчасці пісьменніка 1. Пачатак літаратурный дзейнасці.
4. Этапы літаратурнай дзейнасці.
5. Мастацкія асаблівасці некаторых творау.
6. Пісьменнік і грамадства.
7. Вашы асабістыя адносіны да творчасці гэтага аутара.
8. Значэнне дзейнасці пісьменніка.



## Алгарытм аналізу мастацкага твора.

1.Гісторыя стварэння.
2.Тэматыка і праблематыка мастацкага твора.
3.Ідэйная накіраванасць і эмацыянальны пафас.
4.Жанравая своеасаблівасць.
5.Асноўныя мастацкія вобразы ў іх сістэме і ўнутраных сувязях.
6.Цэнтральныя персанажы.
7.Кампазіцыя, сюжэт і асаблівасць канфлікту.
8.Пейзаж, партрэт, дыялогі і маналогі.
9.Мова і стыль твора (асаблівасці аўтарскага аповеду, апісанні, лірычныя адступленні, разважанні і інш.
10.Месца твора ў літаратурным набытку пісьменніка.
11.Месца ці значэнне твора ў гісторыі літаратуры.

## Прыкладны алгарытм характарыстыкі літаратурнага вобраза-персанажа.

1. Месца персанажа ў сістэме вобразаў твора.
2. Характарыстыка персанажа як адметнага сацыяльнага тыпу: сацыяльнае і матэрыяльнае становішча; своеасаблівасць светаадчування і светапогляду, кола разумовых інтарэсаў, схільнасцей, звычак; характар дзейнасці і асноўныя жыццёвыя мэты; сфера пачуцця (тып адносін з іншымі героямі, асаблівасці ўнутраных перажыванняў).
3. Рысы асобы героя, якія выяўляюцца ў творы: з дапамогай партрэта; у аўтарскай характарыстыцы; праз характарыстыку іншых дзейных асоб; з дапамогай прадгісторыі ці біяграфіі; праз ланцужок учынкаў; у моўнай характарыстыцы; праз узаемаадносіны з іншымі персанажамі.
4. Аўтарскія адносіны да героя.
5. Грамадская (альбо іншая) праблема, якая прывяла аўтара да стварэння гэтага вобраза.

**Характарыстыка персанажа як пэўнага сацыяльнага тыпу.**

**Уступ**. Месца персанажа ў сістэме вобразаў твора.

**Галоўная частка.**

1. Сацыяльнае і матэрыяльнае становішча.

2. Знешні воблік.

3. Своеасаблівасць светаўспрымання і светапогляду, кола разумовых інтарэсаў, схільнасцяў і звычак:
а) характар дзейнасці і асноўных жыццёвых імкненняў;
б) уплыў на тых, хто акружае (асноўная сфера, віды і тыпы ўздзеяння).

4. Сфера пачуццяў:
а) тып адносін да тых, хто акружае героя;
б) асаблівасці ўнутраных перажыванняў.

5. Аўтарскія адносіны да персанажа.

6. Якія рысы асобы героя выяўляюцца ў творы:
а) пры дапамозе партрэта;
б) у аўтарскай характарыстыцы;
в) праз характарыстыку іншых дзеючых асоб;
г) пры дапамозе перадгісторыі або біяграфіі;
д) праз шэраг учынкаў;
е) у размоўнай характарыстыцы;
ж) праз "суседства" з іншымі персанажамі;
з) праз абсталяванне, якое акружае персанаж.

**Заключэнне.** Якая грамадская праблема прывяла аўтара да стварэння дадзенага вобраза?



**План разбору лірычнага верша**

I. Дата напісання верша.
II. Рэальна-біяграфічны і фантастычны каментарый.
III. Жанравая своеасаблівасць.
IV. Ідэйны змест:
1. Вядучая тэма.
2. Асноўная думка.
3. Эмацыянальная афарбоўка пачуццяў, якая выражана ў вершы ў яе дынаміцы ці статыцы.
4. Знешняе ўражанне і рэакцыя на яго.
5. Перавага грамадскіх або асабістых інтанацый.
V. Струкгура верша:
1. Супастаўленне і развіццё асноўных слоўных вобразаў па:
а) падабенстве;
б) кантрасце;
в) сумежнасці;
г) асацыяцыі;
д) разважаннях.
На гэтай аснове прыйсці да вывадаў.
2. Асноўныя выяўленчыя сродкі іншасказання, якія выкарыстоўваюцца аўтарам: метафара, метанімія, сінекдаха, параўнанне, алегорыя, сімвал, гіпербала, літота, іронія (як троп), сарказм, перыфраза.
3. Размоўныя асаблівасці ў плане інтанацыйна-сінтаксічных фігур: эпітэт, паўтор, антытэза, інверсія, эліпс, паралелізм, рытарычнае пытанне, звароты і г.д.
4. Асноўныя асаблівасці рытмікі:
а) танічнае вершаскладанне, сілабічнае, сілаба-танічнае. Дольнік, свабодны верш;
б) ямб, харэй, пірыхій, спандэй, дактыль, амфібрахій, анапест.
5. Рыфма (мужчынская, жаночая, дактылічная, дакладная, недакладная, багатая, простая, састаўная) і спосабы рыфмоўкі (парная, перакрыжаваная, кальцавая), гульня рыфмаў.

6. Строфіка (двухрадкоўе, трохрадкоўе, чатырохрадковая, пяцірадковая, катрэн, секстын, септым, актава, санет).

7. Эўфанія (мілагучнасць) і гукапіс (алітэрацыя, асананс, дысананс), іншыя віды гукавой інструментоўкі.